# Хай цвіце купальская кветка




Метадычны дапаможнік «Купальскі зборнік», які выйшаў у выдавецтве Дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі», створаны ў межах праекта «Народная спадчына Бацькаўшчыны» і з'яўляецца першай часткай у серыі метадычных выданняў паводле этнафоніі беларускіх каляндарных свят і прымеркаваных да іх пазаабрадавых практык.

Аўтар дапаможніка Таццяна Пладунова, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вядомы этнапедагог, артыст-вакаліст вышэйшай катэгорыі, сабрала лепшыя ўзоры купальскіх песень этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Яны былі ў розныя гады запісаны знанымі айчыннымі фалькларыстамі Рыгорам Шырмам, Генадзем Цітовічам, Зінаідай Мажэйка, Галінай Таўлай, Тамарай Варфаламеевай, а таксама студэнтамі і выкладчыкамі спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» БДУКіМ. Сістэматызацыя рэпертуару зборніка па-мастацку пераасэнсавана і абапіраецца на багаты ўласны досвед аўтара па правядзенні фальклорных свят у гарадскім ландшафце (нават з улікам рэгіянальных абрадавых і музычных традыцый).

Таццяна Пладунова атрымала свой першы купальскі досвед у 1996 годзе ў легендарным месцы святкавання постфальклорных Купалляў — вёсцы Вязынка. А ўжо ў 1999-м яна разам са сваімі выхаванцамі з гурта «Верас» і паплечнікамі з гурта «Ветах» (кіраўнік В. Калацэй) падхапіла купальскую эстафету і з гэтага часу штогод выступае адным з завадатараў свята ў ваколіцах Мінска.

Задачай дапаможніка з'яўляецца папулярызацыя найважнейшай формы творчай камунікацыі паміж людзьмі — народнай песні. Вядома, гэта квінтэсенцыя традыцыйнага каляндарнага свята, якое і сёння здольнае прадэманстраваць жыццёвую сілу грамадства ў еднасці адзін з адным і з прыродай. Выданне створана з мэтай дапамагчы кіраўнікам дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў не толькі абраць патрэбны рэпертуар да Купалля, але яшчэ і зладзіць свята ў адпаведнасці з абрадавай картай, распрацаванай аўтарам. Для традыцыйнай культуры беларусаў гэтая карта мае ўніверсальны характар і служыць для сістэматызацыі абрадавых кампанентаў фальклорных свят як даследчы метад іх мастацкага рэканструявання.

На пачатку кожнага раздзела зроблены невялічкія тэматычныя фотападборкі розных часоў з уласнай калекцыі аўтара. Планавалася, што справаздачная купальская фотагалерэя за апошнія 20 гадоў будзе вынесена ў дадатак, але візуальнага матэрыялу было настолькі шмат, што ён можа быць падставай асобнай работы. Хто ведае, можа, гэтым летам на фестывалі фальклору «Берагіня», які якраз праходзіць падчас Купалля, мы не толькі пачуем спевы Таццяны Аляксандраўны, але і пабачым фотавыстаўку, прысвечаную гісторыі праўдзення постфальклорнага свята?

**Вячка КРАСУЛІН**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ